**Ярашынская К.А.,** студ. гр. 404 БДУКМ
Навук. кір. – Ігнатовіч П.Р.,
кандыдат гістарычных навук, прафесар

# УЯЎЛЕННІ АБ ЗВЫШНАТУРАЛЬНЫМ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звышнатуральнае – светапоглядная катэгорыя, якая вызначае тое, што знаходзіцца па-над фізічным светам вымярэнняў і дзейнічае па-за ўплывам законаў прыроды, выпадае з ланцугу прычынных сувязей і залежнасцяў, нешта першаснае ў дачыненні да рэчаіснасці, якое ўздзейнічае на яе, тое, што не можа быць праяўлена ў матэрыяльным свеце.

У рэлігійным сэнсе звышнатуральнае раскрываецца праз паняцці звышпачуццёвага, нецялеснага, непрацяглага існавання, якое немагчыма выявіць знешнімі органамі пачуццяў чалавека і прыладамі. У больш вузкім сэнсе звышнатуральнае таксама можа разглядацца як нейкае вымярэнне іншай, метафізічнай прасторы, напрыклад, замагільнага свету, у якім душа можа знаходзіцца без фізічнага цела.

Так, у нашай традыцыйнай культуры прысутнасць звышнатуральнага характэрна для беларускіх свят, галоўнай ідэяй якіх была ідэя адраджэння і аднаўлення прыроды. Вясной пачынаюцца самыя адказныя сялянскія работы: ворыва, сяўба, выган жывёлы ў поле. Каб абудзіць прыроду і прасіць блаславлення на гаспадарчыя справы, кожны селянін імкнуўся задобрыць вышэйшыя сілы.

Трэба адзначыць, што напачатку для першабытнага чалавака духі не былі чымсьці звышнатуральным, бо ён наогул не адрозніваў натуральнага ад звышнатуральнага, яны належылі да таго ж заканамернага ва ўяўленні першабытных людзей парадку прыроды, як і іншыя прадметы і з'явы. Характэрнай іх адзнакай лічылася тое, што яны могуць быць няўлоўнымі і прымаць выгляд іншых прадметаў. Адсюль і шматлікія міфалагічныя вобразы

і культы – зямлі, вады, агню, дрэў, камянёў, святых крыніц, урочышчаў і г.д.

У ходзе гістарычнага развіцця духі робяцца ўсё больш антрапаморфнымі, набываюць чалавечыя рысы і якасці. “Уяўленне аб тым, што душы памерлых працягваюць сваё існаванне у форме духаў і могуць аказваць уплыў на лёс жывых, з'яўляецца элементам, які аб'ядноўвае анімізм і татэмізм” [3, с. 138]. Толькі ў першым продак уяўляўся не ў выглядзе расліны альбо жывелы, а як дух памерлага. Але ў абедзвюх гэтых формах элементарнага рэлігійнага жыцця неабходна было распрацаваць спосабы ўзаемадзеяння са звышнатуральнымі продкамі, душы якіх пасля смерці аддзяляліся ад цела і перасяляліся ў іншы свет. “Водгук гэтых светаўяўленняў у пэўнай ступені захаваўся да гэтага часу ў стэрэатыпах паводзін людзей, у бытавых звычаях і пахавальных абрадах. Так у час развітання з нябожчыкам люстэрка ў пакоі закрываюць тканінай, каб пазбавіць нябожчыка адбітка (двайніка), упакоіць яго душу” [4, с. 32].

Звышнатуральнае ў традыцыйнай культуры беларусаў характэрна і для абрадаў варажбы. Варажба – комплекс магічных практык і дзеянняў, якія паводле павер’я прадракаюць будучыню, прасвятляюць невядомае ў мінулым ці ў прасторава- адлеглай сучаснасці. Узнікла ў першабытным грамадстве разам з крышталізацыяй веры ў існаванне пэўнага касмічнага парадку, які быў засведчаны людзьмі праз назіранне і супастаўленне з’яваў прыроды, астранамічных цыклаў, паводзін жывёлаў і інш.

Варажба – свайго роду камунікатыўнае ўзаемадзеянне чалавека з навакольнай рэчаіснасцю, якая ёсць для яго ў пэўнай ступені крыніцай інфармацыі. Поспех у сустрэчы з духамі самага рознага кшталту забяспечваўся цэлым комплексам умоў, лакальнымі і тэмпаральнымі характарыстыкамі рытуалу, якія ўсе агулам і кожны паасобку былі накіраваныя на здыманне межаў паміж рознымі светамі і атрыманне з "таго" боку адпаведнага знаку. Каб наладзіць кантакт, той, хто збіраўся варажыць, здымаў крыж і пояс – "размыкаў" абарончую мяжу, развязваў вузлы, часам распранаўся, заплюшчваўся, маўчаў і да т.п.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спрыяльнымі для дасягнення мэтаў варажбы станавіліся месцы “пагранічныя” (печ, парог, вароты, ростані і г.д.), і час, які таксама вылучаўся межавымі, пераломнымі характарыстыкамі. На Беларусі вядомы некалькі сотняў спосабаў і варыянтаў варажбы. Вылучаюцца варожбы гаспадарчыя, накіраваныя на атрыманне ведаў пра будучы ўраджай, прыплод жывёлы, важныя падзеі, варажба на уласнае здароўе, час смерці і найбольш шматлікая група – варажба на будучае замужжа, характар ці выгляд мужа/жонкі, колькасць дзяцей і да т.п.

Рытуалы варажбы ў славян былі добра вядомыя ўжо візантыйцу Пракопу Кесарыйскаму (VII ст.). Ён адзначаў: калі славяне шануюць духаў прыроды і багоў, яны прыносяць ім ахвяры і адначасова варожаць па гэтых ахвярах.

У хрысціянскай традыцыі варажба лічылася начыстай справай, звязанай з чорнай магіяй і чарадзействам. Звышнатуральныя хрысціянскія персанажы сустракаюцца ў вусных народных творах. Яны дзейнічаюць як галоўныя героі ў апакрыфічна-евангельскіх сюжэтах. Напрыклад, у цыкле этыялагічных народнабіблейскіх легенд, аб’яднаных тэмай уцёкаў Святога сямейства ў Егіпет, Божая Маці з Хрыстом-немаўляткам хаваецца ад войска Ірадава пад дрэвы, у выніку чаго, у залежнасці ад сваіх паводзін, дрэвы набываюць пэўныя якасці і вызначаюць на будучыню адносіны да сябе (асіна не схавала Святое сямейства – з тых пор трасецца і лічыцца нядобрым дрэвам; елка апусціла лапкі і схавала Божую Маці – з тых часоў вечназялёная, упрыгожваецца на Каляды, у яе пярун не б’е) [2, с. 36].

У легендах-былічках тыя ж персанажы – Бог, Божая Маці і інш. заўсёды выступаюць як сіла, якая дапамагае чалавеку (значна больш рэдка – карае) у яго прыватным, асабістым жыцці, але галоўны герой тут ужо чалавек.

Міфалагічныя вобразы вусных народных твораў (дамавік, русалка, лесавік, лазнік і інш.) заснаваныя на мясцовых вераваннях, яны набываюць свае канкрэтныя абрысы і выявы толькі ў апавяданнях пра сустрэчу чалавека з імі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хрысціянскія звышнатуральныя персанажы маюць у расказах пра цуды ў вуснай сельскай культуры характэрнае цялеснае ўвасабленне, што выразна адрознівае іх ад традыцый хрысціянскай кніжнасці, вусных расказаў пра цуды ў гарадскім прыхрамавым асяроддзі. Напрыклад, Бог або святы Мікалай у легендах-былічках звычайна паўстаюць у выглядзе старога дзядка. «<Бачыць> – ідэ дэдок, з торбочкою... «То, – <казалі потым людзі>, – Бог тобе прыдався. Ты без бацька годовався, трое дэтэй було. І тэбе Бог прыдався» [1, с. 204]. Бог, святы Мікалай, анёл-ахоўнік паўстаюць амаль у аднолькавым знешнім увасабленні: сівенькі стары дзядок з торбачкай і кіёчкам.

Сярод сельскіх легенд-былічак амаль не сустракаюцца апавяданні пра сустрэчу з Хрыстом, а калі сутракаюцца, то гэта чыста індывідуальнае бачанне, і ў такіх расказах тыповага выгляду Хрыста не існуе.

Існуе ў традыцыйнай культуры таксама вера ў магію і моц слова. “Людзі верылі, што слова і думка валодаюць матэрыяльнай сілай, здольнасцю дзейнічаць на чалавека, як сякера ці страла”[5, с. 21]. Менавіта з верай у тое, што слова можа паўплываць на фізічны стан чалавека, жывёлы і прыродных з’яў, звязаны шматлікія замовы і заклінанні. “Слова – феномен, своеасаблівы код, які адрознівае чалавека разумнага ад усіх іншых істот. Магічныя функцыі і ўладарная моц слова застаюцца да канца неспасцігнутымі… Нашы продкі не кідалі слоў на вецер. Яны добра ведалі магічную сілу слова і прамаўлялі яго ў неабходны момант з асаблівай пранікнёнасцю і сакральным сэнсам, звяртаючыся да добрых ці ліхіх духаў, загаворвалі, малілі, спадзяваліся, заклікалі, улагоджвалі, абяцалі, гналі прэч, заклінालі” [4, с. 154 – 155].

Традыцыйныя язычніцкія замовы цесна звязаныя з хрысціянскімі малітвамі. У часы пераходу да хрысціянства замовы ўстойліва захоўвалі сваю першасную аснову, але дапаўняліся элементамі, сімваламі і вобразамі новай рэлігіі. Часам язычніцкаму тэксту папярэднічаў малітоўны хрысціянскі ўступ. Вянцом замовы-малітвы з’яўляецца слова “амэн”, што азначае “няхай будзе так”. Гэта сведчыць аб веры ў моц слова нават сярод хрысціян.

Нашы продкі вельмі гарманічна зводзілі ў адно свае назіранні над

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыроднымі з’явамі і жылі ў цэласным адзінстве з Маці-прыродай. Тое, што знаходзілася па-за межамі прыроды і не магло быць спасцігнута з дапамогай чалавечага вопыту, надзялялася магічнымі характарыстыкамі. Звышнатуральнымі вобразамі прасякнута ўся традыцыйная культура – найважнейшая частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны, вывучэнне і даследване якой адыгрывае выключную ролю ў ідэнтыфікацыя і самазахаванні беларусаў як этнасу.


1. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд; дап. – Мн. : Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Васілевіч, У. Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер’і / У. Васілевіч / уклад., прадм., перакл. у паказ. У. Васілевіча. – Кніга 3. – Мінск : Беларусь, 2010. – 717 с.

3. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. – М. : Беларусь. – 2011. – 430 с.

4. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова; маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. – Мн. : БелЭн, 2002. – 432 с.

5. Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мн. : Маст. літ., 2000. – 400 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ